Жарыкава А.А.,
выкладчык

## СУЧАСНАЙ АДУКАЦЫІ - НОВЫЯ МЕТАДЫ НАВУЧАННЯ

У апошнія гады ў нашай рэспубліцы ўзрасла цікавасць да новых канцэпцый адукацыі. Сярод іх асаблівую цікавасць уяўляе канцэпцыя мадэліравання прафесійнай дзейнасці пры навучэнні ў ВНУ.

Традыцыйныя метады арганізацыі вучэбнага працэсу ў вышэйшых навучальных установах у многіх сваіх аспектах уступаюць у супярэчнасць з патрабаваннямі, прад'яўляемымі да выпускнікоў як у тэарэтычнай, так і практычнай частцы падрыхтоўкі маладога спецыяліста. Асноўныя складанасці выкліканы падзелам, часам штучным, прафесійных ведаў па розных дысцыплінах і існуючымі метадамі кантролю якасці навучання ў выглядзе экзаменаў, залікаў і іншых відаў работы, якія арыентуюць студэнта на атрыманне неабходных заліковых балаў, а не на глыбокае пазнанне тэарэтычнага матэрыялу і прымяненне яго пры рашэнні прафесійных задач.

Пераадолець гэтыя недахопы павінна дапамагчы новая форма навучання на аснове імітацыйнай мадэлі. Сэнсам яе з'яўляецца стварэнне ў рамках існуючай структуры такога асяроддзя, якое б імітавала прагназуемую прафесійную дзейнасць студэнта. Такая мадэль павінна адпавядаць шэрагу патрабаванняў: папершае, даваць арыентыроўкі, якія з'яўляюцца асновай развіцця здольнасці да адбору, сінтэзу неабходнай інфармацыі; па-другое - забяспечваць эфектыўнасць засваення прыемаў і метадаў праходжання ўсіх звенняў прафесійнай дзейнасці, ад ідэі да яе рэалізацыі; і апошняе - фарміраваць устаноўкі, што павінны быць асновай будучых асабіста-грамадскіх адносін, якія спадарожнічаюць эфектыўнай рэалізацыі прафесійных мэт.

Такая мадэль з'яўляецца сродкам дасягнення галоўнай мэты навучання - падрыхтоўкі спецыяліста, які мае неабходныя прафесійныя здольнасці. Аднак гэты сродак будзе эфектыўны толькі тады, калі ён будзе абапірацца на дамініруючыя патрэбы асобы студэнта, а яны будуць неаднолькавымі на розных ступенях навучання.

Сутнасць імітацыйнай мадэлі заключаецца ў стварэнні для студэнта вучэбнага аналага прагназуемай прафесійнай дзейнасці, што дазваляў бы паэтапна засвоіць прыемы, метады вытворчай дзейнасці з паступовым ускладненнем задач пры адпаведнай узаемасувязі засваення дысцыплін. Для вырашэння гэтай задачы неабходна стварэнне студэнцкіх творчых лабараторый, дзе студэнты будуць асвойваць усе віды практычнай дзейнасці, якія з'яўляюцца атрыбутамі рэальных грамадскіх адносін, займацца навукова-даследчай дзейнасцю. Такі падыход да навучання развівае ў значнай меры прадукцыйны характар дзейнасці, што ў многа разоў дазволіць павысіць эфектыўнасць працэсу падрыхтоўкі спецыялістаў. Але арганізацыя навучання па гэтай мадэлі будзе паспяховай тады, калі працэс індывідуальнай падрыхтоўкі арганізуе адзін выкладчык і ён жа нясе адказнасць за якасць навучання. Выкладчык павінен быць спецыялістам шырокага профілю, разумець сутнасць ўзаемадзеяння паміж дысцыплінамі і яго значэнне для прафесійнай падрыхтоўкі. Мадэль патрабуе таксама псіхалагічнага забеспячэння, а гэта значыць, і адпаведнай кваліфікацыі выкладчыка.

Такім чынам, імітацыйная мадэль навучання - адна з перспектыўных канцэпцый арганізацыі адукацыйнага працэсу.

Яноўскі М.З.,
дацэнт

## МАГЧЫМАСЦІ МАСТАЦКА-ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў ФАРМІРАВАННІ НЕКАТОРЫХ ПРАФЕСІЙНА ВАЖНЫХ ЯКАСЦЕЙ АСОБЫ

Адной з актуальных праблем прыкладной псіхалогіі навучання ўяўляюцца вывучэнне і разуменне заканамернасцей, механізмаў прафесійна важных уменняў, навыкаў, сінтэтычных якасцей у будучых спецыялістаў у розных відах дзейнасці, у тым ліку педагагічнай. Неабходны іх набор, як правіла, фарміруецца і назапашваецца шляхам спецыяльнай выпрацоўкі ў адпаведнасці з мэтамі і патрабаваннямі канкрэтнай дзейнасці. Аднак у рэальнай практыцы нярэдка гэтыя прафесійна важныя якасці могуць быць сфарміраваны не шляхам практыкаванняў, паўтораў, спецыяльнай мэтанакіраванай працай па іх фарміраванню і развіццю, а шляхам «запазычання» іх з іншых, раней назапашаных навыкаў і ўменняў, зместу дзейнасці, якія чалавек рэалізоўваў па-за рамкамі асноўнай асабіста прафесійнай актыўнасці. Назапашванне такога фонду аперацый, дзеянняў, навыкаў адбываецца часцей латэнтна, несвядомым і міжвольным характарам актыўнасці асобы. Гэтыя аперацыі, дзеянні, навыкі могуць быць выкарыстаны і ўключаны ў іншыя віды дзейнасці, забяспечваючы павышэнне іх прадукцыйнасці, якасці, аптымізацыю працякання і эфектыўнасць у цэлым.

Псіхалагічную прыроду і сутнасць указанай з'явы можна назваць «механізмам станоўчага пераносу», пад якім разумеюць станоўчы ўплыў высока аўтаматызаваных дзеянняў, аперацый, навыкаў, склаўшыхся ў выніку навучання і

практыкаванняў у адным відзе дзейнасці, на фарміраванне і актуалізацыю новых сістэм навыкаў у іншых відах практычнай і тэарэтычнай дзейнасці. Пры гэтым выпрацаваныя раней першасныя навыкі палягчаюць набыццё і рэалізацыю новых актуалізаваных сістэм дзеянняў і аперацый на этапе іх першапачатковай і паўторнай аўтаматызацыі.

У шырокім сэнсе можна гаварыць пра «эфект пераносу» не толькі пры ўзаемадзеянні лакальных навыкаў, але і пры ўзаемадзеянні больш складаных іх сістэм, а таксама зместу розных відаў дзейнасці.

З практыкі вядома, напрыклад, што навучанне складанаму працэсу прыему і перапрацоўкі інфармацыі па сістэме азбукі Морзе асоб з музычнай падрыхтоўкай праходзіць значна прадуктыўней і эфектыўней у параўнанні з асобамі, якія не маюць музычнай падрыхтоўкі, а навучанне піяністаў друкаванню па пішучай машыны будзе праходзіць больш паспяхова, эканамічна, менш напружана ў параўнанні з непіяністамі. Сістэмы складаных сінтэзаў сенсорных, маторных, мнемічных і мысліцельных па механізму пераносу працэсаў, уключаемыя ў структуру новых засвойваемых дзеянняў, забяспечваюць больш прадукцыйнае засваенне і рэалізацыю адпаведных навыкаў у новай дзейнасці.

Нашы даныя сведчаць пра тое, што такія мастацка-творчыя віды дзейнасці, як тэатральная, вакальна-музычная, выяўленчая, харэаграфічная, па механізму пераносу садзейнічаюць развіццю, аптымальнаму праяўленню вербальных і невербальных, камунікатыўных, кантрольна-карэкціруючых, рэфлексіўных, эмацыянальна-моўных, кагнітыўна-моўных і іншых важных псіхічных функцый, неабходных у вырашэнні разнастайных прафесійных задач педагогамі, лектарамі, адвакатамі, кіраўнікамі рознага тыпу і інш. Такое разуменне мастацка-творчых відаў дзейнасці дазваляе разглядаць іх магчымасці ў новым аспекце. Мы маем на ўвазе іх спецыфічныя прыкладныя функцыі, якія патэнцыяльна і актуальна пашыраюць дыяпазон прафесійна важных якасцей асобы, што рэалізуюцца ў іншых відах дзейнасці.

Так, тэатральная творчасць у прыкладным аспекце па механізму пераносу фарміруе ў педагогаў прафесійна значныя навыкі самапазнання, актыўнага самакантролю мовы, эмацыянальнага складу мімічнай і пантамімічнай выразнасці, камунікатыўныя паводзіны. Развіваючы спецыяльнымі практыкаваннямі крэатыўнасць мыслення, гэта творчасць дазваляе больш актыўна і ўсвядомлена вырашаць разнастайныя выхаваўчыя і вучэбныя задачы, выкарыстоўваючы элементы імправізацыі ці поўную імправізацыю. Рафлексіўныя працэсы, якія развіваюцца ў тэатральнай дзейнасці, спрыяюць аптымізацыі плануючай, кантрольна-карэкціруючай функцый у арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу педагогамі, садзейнічаюць пашырэнню дыяпазону актывізацыі педагагічнай назіральнасці і ўяўлення.

Музычна-вакальная дзейнасць, фарміруючы і ўдасканальваючы інтэгральна псіхафізіялагічныя механізмы моварухальнага аналізатара, галасавы апарат у яго тонкіх разнастайных праяўленнях у ёй, садзейнічае развіццю і лёгкай, дынамічнай практычнай рэалізацыі такіх прафесійна важных моўных функцый, як магутнасць, гібкасць і рухавасць голасу, дыкцыя, інтанацыйная выразнасць, эмацыянальнасць. Музычна-вакальная дзейнасць стварае псіхалагічныя перадумовы для прадукцыйнага фарміравання шырокага дыяпазону разнастайных моўных навыкаў і ўменняў.

Спецыяльныя навыкі і ўменні, сфарміраваныя ў выяўленча-творчай дзейнасці, міжвольна могуць быць перанесены ў метадычныя аспекты педагога, узнімаючы якасць рашэння ім разнастайных дыдактычных задач на ўроку. Яны могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы нагляднага матэрыялу, дапаможнікаў, а таксама пры дынамічным параджэнні іх у працэсе выкладання вучэбнага матэрыялу ў выглядзе графічных, плоскасных выяў, структурна-лагічных схем і інш.

З пазіцыі вышэйпададзенага ў мастацка-творчых відах дзейнасці неабходна бачыць важную магчымасць - прафесійна-прыкладное развіццё якасцей асобы праз змест разнастайных спецыяльных навыкаў, уменняў, якія па механізму пераносу актуалізуюцца ў іншых відах дзейнасці, павышаючы іх якасць і прадукцыйнасць.

Грачова В.А.,
ст.выкладчык

## ПРЫЕМЫ ЎКЛЮЧЭННЯ З'ЯЎ МАСТАЦТВА Ў НАВУЧАЛЬНЫ ПРАЦЭС ПРЫ ВЫВУЧЭННІ АГУЛЬНАЙ ПЕДАГОГІКІ

Спецыфікай выкладання курса агульнай педагогікі ва універсітэце культуры з'яўляецца неабходнасць насычэння навучальнага працэсу матэрыяламі, якія спалучаюць рацыянальную інфармацыю з эмацыянальнай. Гэта неабходнасць грунтуецца на асаблівасцях навучэнцаў, таму што большасць з іх належыць да мастацкага тыпу. Мы ўжо пераканаліся ў мэтазгоднасці выкладання гісторыі педагогікі ў кантэксце гісторыі сусветнай і айчыннай мастацкай культуры. Была выпрацавана пэўная схема групавання і прад'яўлення мастацкіх твораў і з'яў на лекцыях, прысвечаных адпаведным тэмам. За-